Минский городской исполнительный комитет
Администрация Ленинского района г. Минска
ГОСУДАРСТВЕННАЯ РЕГИСТРАЦИЯ
Регистрационный номер 100377901
« 06 » 03 2013 г.
(дата)
(подпись) Т.Н. Жмайлик
(фамилия, инициалы)

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
04.03.2013 № 24

# СТАТУТ

## Дзяржаўнай установы
## «Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы»

(новая рэдакцыя)

# УСТАВ

## Государственного учреждения
## «Национальный академический театр имени Янки Купалы»

(новая редакция)

г. Мінск
2013

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дзяржаўная ўстанова “Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы” (далей – Тэатр) створана на нявызначаны тэрмін.

Заснавальнікам Тэатра з’яўляеца Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Тэатр пачаў дзейнасць на падставе рашэння Беларускага ўрада 14 верасня 1920 года. Згодна з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 13 снежня 1993 г. № 840 “О переименовании Белорусского государственного академического театра имени Янки Купалы и условиях оплаты труда работников театра” Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы перайменаваны ў Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы.

2. Поўнае найменне Тэатра на беларускай мове – Дзяржаўная ўстанова “Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы”, на рускай мове – Государственное учреждение “Национальный академический театр имени Янки Купалы”.

Скарочанае найменне Тэатра на беларускай мове – Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, на рускай мове – Национальный академический театр имени Янки Купалы.

3. Месцазнаходжанне тэатра: 220030, Рэспубліка Беларусь, горад Мінск, вуліца Энгельса, 7.

4. Тэатр дзейнічае на аснове заканадаўства Рэспублікі Беларусь і дадзенага Статута.

5. Тэатр з’яўляецца юрыдычнай асобай, мае адасобленую маёмасць на праве аператыўнага кіравання, нясе самастойную адказнасць па сваіх абавязацельствах, можа ад свайго імя набываць і ажыццяўляць маёмасныя і асабістыя немаёмасныя правы, выконваць абавязкі, быць істцом і адказчыкам у судзе, адкрываць разліковы, валютны і іншыя рахункі ў банках, мець пячатку, штампы і бланкі з выявай дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і са сваім найменнем, а таксама іншыя пячаткі і штампы.

6. Тэатр ажыццяўляе валоданне і карыстанне замацаваным за ім на праве аператыўнага кіравання маёмасцю, грашовымі сродкамі (у тым ліку ў замежнай валюце) у парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і дадзеным Статутам.

7. Тэатр адказвае па сваіх абавязацельствах грашовымі сродкамі, якія знаходзяцца ў яго распараджэнні. Пры іх недастатковасці субсідыярную адказнасць па абавязацельствах Тэатра нясе ўласнік маёмасці.

8. Тэатр можа выступаць у якасці ўдзельніка гаспадарчых аб'яднанняў і ўкладчыка ў камандытных таварыствах з дазволу ўласніка (упаўнаважанага ім органа). Тэатр можа быць заснавальнікам фондаў і іншых юрыдычных асоб у парадку, вызначаным дадзеным Статутам і заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

9. Тэатр у двухмесячны тэрмін уносіць у Статут адпаведныя змяненні і (альбо) дапаўненні і прадстаўляе іх ва ўстаноўленым парадку для дзяржаўнай рэгістрацыі ў выпадку:

змянення наймення Тэатра;

змены уласніка маёмасці.

10. Тэатр мае адасобленае падраздзяленне "Служба грамадскага харчавання і гандлю" дзяржаўнай установы "Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы".

Месцазнаходжанне: 220030, Рэспубліка Беларусь, горад Мінск, вуліца Энгельса, 7.

11. Рэарганізацыя і ліквідацыя Тэатра праводзіцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 2
## МЭТЫ, НАПРАМКІ І ПРАДМЕТ ДЗЕЙНАСЦІ ТЭАТРА

12. Асноўнымі мэтамі дзейнасці Тэатра з'яўляюцца:

эстэтычнае выхаванне фізічных асоб;

фарміраванне і задавальнення патрэбнасцей фізічных асоб у сцэнічным мастацтве;

папулярызацыя твораў сцэнічнага мастацтва і творчай дзейнасці выканаўцаў.

Асноўнымі напрамкамі дзейнасці Тэатра з'яўляюцца:

стварэнне твораў сцэнічнага мастацтва і правядзенне культурна-відовішчных мерапрыемстваў;

арганізацыя і правядзенне іншых культурных мерапрыемстваў;

правядзенне стажыровак вядучымі майстрамі Тэатра і дзеячамі культуры і мастацтва;

выраб і прадастаўленне юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам па дагаворах з імі сцэнічна-пастановачных сродкаў для правядзення культурна-відовішчных мерапрыемстваў;

прадастаўленне сцэнічных пляцовак для правядзення культурна-відовішчных мерапрыемстваў юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам;

ажыццяўленне сумесных культурных праектаў з іншымі тэатрамі;

падрыхтоўка, тыражаванне і рэалізацыя выданняў інфармацыйна-даведачнага характару, відэаматэрыялаў і фанаграм, звязаных з культурнай дзейнасцю Тэатра;

рэалізацыя спадарожных паслуг, якія прадастаўляюцца гледачам Тэатра.

13. Прадметам дзейнасці Тэатра ў адпаведнасці з Агульнадзяржаўным класіфікатарам Рэспублікі Беларусь АКРБ 005-2006 "Віды эканамічнай дзейнасці", зацверджаным пастановай Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2006 г. № 65 "Об утверждении, введении в действие, изменении и отмене технических нормативных правовых актов в области технического нормирования и стандартизации и общегосударственного классификатора Республики Беларусь", з'яўляецца:

аздабленне тканін і тэкстыльных вырабаў (код 1730);

вытворчасць іншых тэкстыльных вырабаў, не ўключаных у іншыя групіроўкі (код 1754);

вытворчасць гатовага трыкатажнага адзення машыннага і ручнога вязання (код 1772);

вытворчасць верхняга адзення (код 18220);

вытворчасць іншага адзення і аксесуараў (код 1824);

вытворчасць абутку (код 19300);

вытворчасць вырабаў з коркі, саломкі і матэрыялаў для пляцення (код 20520);

выдавецкая дзейнасць (код 221);

паліграфічная дзейнасць і прадастаўленне паслуг у гэтай галіне (код 222);

капіраванне гуказапісаў (код 22310);

капіраванне відэазапісаў (код 22320);

аптовы гандаль і гандаль праз агентаў, акрамя гандлю аўтамабілямі і матацыкламі (код 51);

рознічны гандаль, акрамя гандлю аўтамабілямі і матацыкламі; рамонт бытавых вырабаў і прадметаў асабістага выкарыстання (код 52);

прадастаўленне паслуг рэстаранамі (код 55300);

прадастаўленне паслуг барамі (код 55400);

прадастаўленне паслуг сталовымі пры прадпрыемствах і ўстановах (код 55510);

дзейнасць іншага сухапутнага пасажырскага транспарту, які не падпарадкоўваецца раскладу (код 60230);

дзейнасць аўтамабільнага грузавога транспарту (код 60240);

захаванне і складзіраванне (код 63120);

экскурсійнае абслугоўванне (код 63303);

здача ў наём уласнай нерухомай маёмасці (код 70200);

арэнда машын і абсталявання без аператара і пракат бытавых вырабаў і прадметаў асабістага карыстання (код 71);

даследаванне кан'юнктуры рынку і выяўленне грамадскай думкі (код 7413);

іншая дзейнасць у галіне права (код 74119);

рэкламная дзейнасць (код 74400);

дзейнасць у галіне фатаграфіі (код 74810);

прапанова іншых паслуг спажыўцам (код 74870);

іншая адукацыя для дарослых і іншая адукацыя, не ўключаная ў іншыя групіроўкі (код 80424);

дзейнасць, звязаная з кіна- і відэафільмамі (код 921);

дзейнасць у галіне радыёвяшчання і тэлебачання (код 92200);

тэатральная дзейнасць (код 92311);

канцэртная дзейнасць (код 92312);

дзейнасць у галіне мастацкай творчасці (код 92313);

дзейнасць канцэртных і тэатральных залаў і іншых устаноў культуры (код 9232);

дзейнасць інфармацыйных агенцтваў (код 92400);

іншая дзейнасць па арганізацыі адпачынку і забаўленняў, не ўключаная ў іншыя групіроўкі (код 92720).

14. Згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 1 верасня 2010 г. № 450 "О лицензировании отдельных видов деятельности" Тэатр можа ажыццяўляць:

ахоўную дзейнасць;

дзейнасць у галіне аўтамабільнага транспарту;

дзейнасць, звязаную са службовай і грамадзянскай зброяй і боепрыпасамі да яе, калекцыяніраваннем і экспанаваннем зброі і боепрыпасаў;

рознічны гандаль алкагольнымі напоямі і (ці) тытунёвымі вырабамі.

15. Віды дзейнасці, якія падлягаюць ліцэнзаванню, могуць ажыццяўляцца пасля атрымання спецыяльных дазволаў (ліцэнзій) ва ўстаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь парадку.

16. Тэатр мае права праводзіць культурна-відовішчныя мерапрыемствы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 3
## ПАРАДАК УТВАРЭННЯ МАЁМАСЦІ, РАСПАРАДЖЭННЯ МАЁМАСЦЮ І РАЗМЕРКАВАННЯ ДАХОДУ ТЭАТРА

17. Маёмасць Тэатра складаюць асноўныя фонды і абаротныя сродкі, а таксама іншыя каштоўнасці, кошт якіх адлюстроўваецца ў самастойным балансе Тэатра.

18. Крыніцамі фарміравання маёмасці Тэатра з'яўляюцца бюджэтныя сродкі, якія вылучаюцца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

Іншымі крыніцамі фарміравання маёмасці Тэатра з'яўляюцца:

даходы, атрыманыя ад дзейнасці, якая прыносіць даход;

крэдыты банкаў і іншых крэдытораў;

бязвыплатная (спонсарская) дапамога, ахвяраванні;

іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

19. Тэатр мае права ажыццяўляць дзейнасць, якая прыносіць даход. Атрыманыя ад такой дзейнасці даходы і набытая за іх кошт маёмасць паступаюць у самастойнае распараджэнне Тэатра і ўлічваюцца на асобным балансе.

20. Тэатр у адносінах да замацаванай за ім маёмасці ажыццяўляе ў межах, установленых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з мэтамі сваёй дзейнасці, заданнямі ўласніка і прызначэннем маёмасці, права ўладання, карыстання і распараджэння гэтай маёмасцю.

21. Тэатр не можа без згоды ўласніка адчужаць ці іншым чынам распараджацца замацаванай за ім маёмасцю і маёмасцю, набытай за кошт сродкаў, вылучаных яму па каштарысу, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

Уласнік маёмасці, замацаванай за Тэатрам, мае права забраць лішнюю маёмасць, якая не выкарыстоўваецца або выкарыстоўваецца не па прызначэнні, і распарадзіцца ёю па сваім меркаванні.

22. Тэатр у парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляе здзелкі па распараджэнню маёмасцю Тэатра.

23. Тэатр у парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, адчужае маёмасць, якая належыць яму на праве аператыўнага кіравання.

24. Здача Тэатрам у арэнду маёмасці, што знаходзіцца ў яго аператыўным кіраванні, або перадача ўказанай маёмасці ў бязвыплатнае карыстанне дапускаецца толькі з дазволу Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

25. Унясенне маёмасці, якая знаходзіцца ў карыстанні ў якасці ўкладу ў статутныя фонды (выкарыстанне яе для набыцця акцый) юрыдычных асоб недзяржаўных форм уласнасці, ажыццяўляецца з дазволу Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

26. Тэатру забараняецца выступаць гарантам альбо паручыцелем перад банкам і крэдыторамі юрыдычных асоб недзяржаўных форм уласнасці і фізічных асоб па выкананню гэтымі асобамі сваіх абавязацельстваў па вяртанню атрыманых сродкаў.

# ГЛАВА 4
# КІРАЎНІЦТВА ТЭАТРАМ

27. Выканаўчым органам Тэатра з'яўляецца генеральны дырэктар Тэатра. Генеральны дырэктар Тэатра наймаецца па кантракту Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь з ліку асоб, якія валодаюць неабходнай кваліфікацыяй і вопытам.

28. Генеральны дырэктар Тэатра:

нясе адказнасць за выкананне ўскладзеных на яго Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь задач, арганізацыю творчай працы, высокі ідэйны і мастацкі ўзровень тэатральных пастановак, канцэртных праграм і іншых культурна-відовішчных мерапрыемстваў;

забяспечвае выкананне гаспадарча-творчых планаў Тэатра;

наймае і звальняе работнікаў у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь;

прадстаўляе Тэатр без даверанасці ў дзяржаўных органах Рэспублікі Беларусь і ў адносінах з юрыдычнымі і фізічнымі асобамі;

у межах заканадаўства Рэспублікі Беларусь і Статута распараджаецца маёмасцю і сродкамі Тэатра;

заключае дагаворы ад імя Тэатра;

адкрывае ў банках разліковы, валютны і іншыя рахункі;

у адпаведнасці з правіламі ўнутранага працоўнага распарадку прымяняе меры заахвочвання ці дысцыплінарнага спагнання да работнікаў Тэатра;

выдае даверанасці;

выдае загады і іншыя лакальныя нарматыўныя прававыя акты, дае распараджэнні, абавязковыя для выканання ўсімі работнікамі Тэатра;

зацвярджае структуру і штатны расклад Тэатра;

запрашае пры вытворчай неабходнасці рэжысёраў, драматургаў, сцэнографаў, мастакоў, балетмайстраў, харэографаў, кампазітараў, артыстаў з іншых тэатраў на разавыя пастаноўкі спектакляў і аднаўленне спектакляў;

рэгулярна (не менш аднаго раза ў год) трымае справаздачу перад Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, а таксама прадстаўляе яму неабходную інфармацыю аб дзейнасці Тэатра;

нясе адказнасць за вынікі працы Тэатра, выкананне патрабаванняў Статута, абавязацельстваў перад Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і працоўным калектывам работнікаў Тэатра;

адказвае перад наймальнікам згодна з ўмовамі, вызначанымі ў працоўным кантракце.

## ГЛАВА 5
## ПРАЦОЎНЫ КАЛЕКТЫЎ РАБОТНІКАЎ ТЭАТРА

29. Працоўныя адносіны з работнікамі Тэатра, з улікам пытанняў найма і звальнення, рэжымаў працы і адпачынку, умоў аплаты працы, гарантый і кампенсацый рэгулююцца працоўнымі дагаворамі (кантрактамі) у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

30. Працоўны калектыў работнікаў Тэатра:

вырашае пытанні заключэння з адміністрацыяй калектыўнага дагавора, разглядае яго праект і ўпаўнаважвае прафсаюзны камітэт Тэатра (старшыню прафсаюзнага камітэту) падпісаць яго ад імя працоўнага калектыву работнікаў Тэатра;

вырашае іншыя пытанні самакіравання працоўнага калектыву работнікаў Тэатра ў межах сваёй кампетэнцыі, установленай заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і Статутам.

31. Асноўнай формай ажыццяўлення працоўным калектывам работнікаў Тэатра сваіх паўнамоцтваў з'яўляецца агульны сход.

32. Агульны сход працоўнага калектыву работнікаў Тэатра склікаецца старшынёй прафсаюзнага камітэта Тэатра па меры неабходнасці.

33. Агульны сход працоўнага калектыву работнікаў Тэатра лічыцца правамоцным, калі на ім прысутнічае не менш 2/3 работнікаў Тэатра.

34. Агульны сход працоўнага калектыву работнікаў Тэатра вырашае пытанні, аднесеныя да яго кампетэнцыі, простай большасцю галасоў работнікаў, што прысутнічаюць на сходзе.

35. Для кіраўніцтва сваёй працай агульны сход выбірае старшыню агульнага сходу, для ажыццяўлення іншых тэхнічных функцый – сакратара.